Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 СТУДЗЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 5 (27615) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Лаўрэаты спецпрэміі Прэзідэнта Беларусі: хто ёсць хто

СТАР.3

Які ён, дом начнога знаходжання, і яго насельнікі?

СТАР.5

Першы слуцкі пояс вярнуўся на радзіму

СТАР.6

МАЙСТЭРСТВА БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМІ

Шчасце — гэта вялікае майстэрства, якое кожны чалавек штодзень стварае сваімі рукамі. Такое меркаванне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў 12 студзеня на традыцыйным прыёме з нагоды старога Новага года, перадае карэспандэнт БЕЛТА .

Фота БЕЛТА.

«Наша шчасце — не божы дар, а вялікае майстэрства, якое кожны чалавек штодзень стварае сваімі рукамі. І толькі ад нас залежыць, наколькі больш шчаслівымі мы зможам стаць у новым годзе», — сказаў беларускі лідар.

На прыём былі запрошаны вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, дзеячы культуры, спорту, журналісты.

«Усім нам хочацца, каб наша краіна была паспяховай. Але ў чым праяўляецца гэты поспех? За лічбамі і паказчыкамі мы часта не заўважаем больш важныя рэчы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Адзін разумны чалавек заўважыў: «Паспяховая тая краіна, у якой ёсць алімпійскія чэмпіёны, Акадэмія навук і нацыянальнае оперное мастацтва».

Паводле слоў Прэзідэнта, гэта, магчыма, непрывычны погляд, але разам з тым мастацтва — гэта духоўнасць, навука — інтэлект, а спартыўныя перамогі — сплаў сілы духу і фізічных магчымасцяў чалавека. «Любы поспех у гэтых сферах прадстаўляе дзяржаву ў свеце лепш за ўсялякую дыпламатыю. І калі ў краіне ёсць умовы, каб развіваць гэтыя таленты, значыць, гэта пасапраўднаму паспяховая краіна. Прынамсі, можа прэтэндаваць на такое званне», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што перамогі на буйных міжнародных спаборніцтвах або вырашальны гол у матчы — гэта не проста эпізоды спартыўнага жыцця, а мяжа чалавечых сіл, пераступіць якую часам уяўляецца немагчымым. «Але кожны раз яна пераадольваецца неймаверным намаганнем і напружаннем волі. У такія імгненні кожны адчувае надзвычайны душэўны ўздым і гонар за гэта пераможнае імгненне, за нашу краіну», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што таксама і ў творчасці. Напрыклад, калі артыст выходзіць на сцэну такога конкурсу, як «Еўрабачанне», яго слухае ўся Еўропа і па адной яго песні мяркуюць аб усёй краіне. «У такой сітуацыі складана нават даросламу артысту, а што гаварыць аб дзецях? Але нашы дзеці штогод праслаўляюць Беларусь на гэтым прэстыжным конкурсе. Пара б і дарослым узяць прыклад з дзяцей», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што такія дасягненні дастойныя самага высокага дзяржаўнага прызнання.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і Падзякі Прэзідэнта заслужаным людзям краіны. «Сёння мы ўшаноўваем тых, хто дабіўся поспеху ў творчасці, спорце, на дзяржаўнай службе дзякуючы вялікай працавітасці, любові да сваёй справы і веры ў сябе. Яны ішлі наперад да вяршынь, таму што былі па-сапраўднаму, горача ўлюбёныя ў сваю справу і не прывыклі адступаць перад цяжкасцямі. У гэтым і заключаецца сапраўдны патрыятызм», — падкрэсліў Прэзідэнт.

За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у дзяржаўнае будаўніцтва і сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ордэна Айчыны III ступені ўдастоены кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэй Кабякоў, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый Вакульчык.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны таксама міністр абароны Юрый Жадобін і міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч за ўзорнае выкананне воінскага абавязку, службовых абавязкаў, высокі прафесіяналізм і ўмацаванне абараназдольнасці дзяржавы.

Ордэнам Пашаны адзначаны памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў і старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына.

Аляксандр Лукашэнка ўдастоіў дзяржаўных узнагарод членаў каманды Прэзідэнта Беларусі па хакеі.

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны Вадзім Бекбулатаў.

Медалём «За працоўныя заслугі» адзначаны Дзмітрый Баскаў, Алег Мікульчык, Сяргей Шыткоўскі, Алег Антоненка, Сцяпан Панамароў і Уладзімір Цыплакоў.

Ганаровае званне заслужанага трэнера Беларусі прысвоена Андрэю Гусаву, заслужанага майстра спорту Беларусі — Андрэю Асташэвічу, Паўлу Беламу, Сяргею Задзяленаву, Андрэю Міхалёву і Генадзю Савілаву.

Медалём «За працоўныя заслугі» таксама ўзнагароджаны спартсмен-інструктар хакейнага клуба «Гомель» Леанід Грышукевіч.

Гэтай жа ўзнагародай адзначаны заслугі артыста-вакаліста Магілёўскай абласной філармоніі Іскуі Абалян.

Медаля Францыска Скарыны ўдастоены артысты-вакалісты Маладзёжнага тэатра эстрады Вікторыя Алешка і Дзмітрый Танюкевіч, аглядальнік рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» Аэліта Сюльжына, намеснік галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант.

Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена артысту-вакалісту (салісту) Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь Дзмітрыю Качароўскаму за высокія творчыя дасягненні і значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры.

Акрамя таго, за значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, асвятленне падзей грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена рэдактару аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» Святлане Протас і спецыяльнаму карэспандэнту ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Марыне Цімафеевай.

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў медалём Францыска Скарыны мастацкага кіраўніка музычнага прадзюсарскага цэнтра «Залатыя галасы» Валерыя Шмата.

Выканаўчаму прадзюсару галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 2» Белтэлерадыёкампаніі Людміле Барадзіной прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

Такой высокай ацэнкі яны ўдастоены за значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры, папулярызацыю беларускага музычнага мастацтва і выхаванне творчай моладзі, актыўны ўдзел у падрыхтоўцы дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013».

СТАР.2

«НОВЫ ГОД ВАМ ПАЧЫНАЮ»

ПРАКАВЕТНАЕ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Чаму на Шчадрэц стол павінен быў ламіцца ад страў, а 14 студзеня ў хаце ўжо не павінна быць навагодняй ёлкі

Дазвольце спытаць, шаноўныя: як вы правялі ўчарашні вечар? Проста ляглі спаць, паглядзеўшы канцэрт, прымеркаваны да гэтага дзіўнага свята, якое адзначаюць толькі на прасторах былога Саюза, — старога Новага года? Гэта вы дарэмна... Таму што, згодна з беларускай народнай традыцыяй, якой ужо не адна сотня (а можа, і тысяча?) гадоў, гэта адзін з самых сімвалічных вечароў года, падчас якога сям'я ні больш ні менш — «праектавала» жыццё і дабрабыт на бліжэйшыя дванаццаць месяцаў.

Яго нездарма называюць Шчадрэц, Шчадруха, Таўстуха, Багатуха. Стол, за якім падчас вячэры 13 студзеня збіралася ўся сям'я, павінен быў літаральна ламіцца ад розных страў: тут і куцця, і мяса з каўбасамі, і кіслая капуста, і мочаныя яблыкі, і салёныя грыбы.

— Стол на Багатую куццю фактычна факусіраваў у сабе ўвесь каляндарны год, — расказвае этнограф, кандыдат філалагічных навук, галоўны рэдактар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Янка Крук. — Таму на ім павінна было прысутнічаць усё тое, на ўраджай і прыбытак чаго разлічвалі.

Куцця на гэтым стале займала ўсё тое ж пачэснае месца каля чырвонага кута, але яна, хоць і «шчодрая», не была тут галоўнай стравай. Гэту ролю выконвалі бліны, дакладней іх стос, у якім было дванаццаць штук — па колькасці месяцаў. Менавіта іх першымі ставілі на абрус. Пасля стос разразалі крыж-накрыж на чатыры часткі і кожны з радзіны за сталом браў па кавалку. Такім чынам стос (ён жа — год) знікаў з талеркі «па спіралі».

СТАР.3

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:

«6,5 млн кв. м жылля плануецца пабудаваць у краіне ў 2014 годзе. У тым ліку плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 2,5 млн кв. м жылля за кошт дзяржаўнай падтрымкі. Гэта самы галоўны паказчык для нас. Таксама сёлета актыўна будзе весціся будаўніцтва па дзяржзаказе. Сэнс гэтага будаўніцтва заключаецца ў тым, каб выключыць чалавека з працэсу будаўніцтва: пабудаваць цалкам аб'ект, а затым прапанаваць яго ў першую чаргу тым, хто маюць патрэбу, каб людзі бралі крэдыт у банку і адразу пачыналі жыць і вяртаць затрачаныя на будаўніцтва грошы. Акрамя таго, актыўна будзе ажыццяўляцца праграма па будаўніцтве арэнднага жылля».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.01.2014 г.

Долар ЗША	9540,00	■
Еўра	13040,00	▲
Рас. руб.	288,00	▲
Укр. грыўня	1150,26	▼

Мітрапаліт ПАВЕЛ:

«ТОЕ, ЯК МЯНЕ ТУТ ПРЫМАЮЦЬ, ПЕРАСЯГНУЛА ЎСЕ МАЕ ЧАКАННІ»

Прайшло ўсяго 10 дзён, як у Беларусь прыбыў новы кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы. Надта мала часу нават для першых вынікаў. Па сутнасці, цяпер адбываецца ўзаемнае знаёмства паствы і пастыра. І казаць можна толькі пра першыя ўражанні. Таму мы пакуль не прасілі мітрапаліта Паўла аб вялікім інтэрв'ю для нашай газеты і задалі Яго Высокапраасвяшчэнству толькі адно пытанне. Такая кароткая размова адбылася яшчэ і таму, што здарылася яна на хаду, адразу пасля літургіі ў Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы, у дзень памяці 14 тысяч немаўлятак Віфлеемскіх.

Фота Уладзіслава КУЛЕЦКАГА.

— Уладыка, прайшоў тыдзень, як вы ступілі на беларускую зямлю ў якасці Патрыяршага Экзарха. Гэта быў цяжкі тыдзень?

— Вы ведаеце, як і ўсе нашы богаслужэбныя дні, і гэтыя былі загружаны, фізічна стамляешся, але духоўна проста лятаць хочацца. Любы чалавек, які здзяйсняе подзвіг на сваім шляху да Бога, фізічна, безумоўна, заўсёды стамляецца, бо плоць нядужая, слабая, але дух ад гэтага робіцца больш лёгкім, больш дасканалым. Гэтак жа і мінулы тыдзень: ён быў напоўнены і набажэнствамі, і малітвай, і зносінамі з паствай, і з пастырамі...

І хачу сказаць, што тое, як мяне тут прымаюць, перасягнула ўсе мае чаканні. І дарэмнай аказалася ўся мая боязь. Думаў у пачатку: як будзе, што будзе... Але я вельмі часта кажу: як толькі трапляю ў любой краіне ў праваслаўны храм, у мяне адразу ўзнікае адчуванне, што я дома. Тут мяне з любоўю прымаюць. Маё сэрца радуецца, бо я бачу цудоўных прыхаджан, добрых, поўных глыбокай пашаны да Бога. Я прыехаў не ў пустыню.

СТАР.2

■ Надвор'е

НАПРЫКАНЦЫ ТЫДНЯ — МАРАЗЫ ДА МІНУС 18

У аўторак тэрыторыя Беларусі трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, якая была сфарміравана ў халодным паветры поўдня Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Таму будзе воблачна з праясненнямі і без істотных ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца, вецер няўстойлівы слабы. Максімальная тэмпература паветра — ад 0 да мінус 6 градусаў. А вось у сераду, пад уплывам атмасферных франтоў з боку Заходняй Еўропы, амаль паўсюдна прагназуецца снег, а па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей магчымы дождж і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ў ноч на сераду будзе вагацца ад мінус 1 градуса па паўднёвым захадзе да 13 марозу па паўночным усходзе краіны. Удзень чакаецца мінус 1—7 градусаў, а па поўдні Беларусі — каля 0. Тэмпература паветра на працягу сутак у чацвер будзе вагацца ў межах мінус 2-8 градусаў, толькі ўначы па поўначы — 9—12 марозу.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу і суботу атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў ужо не будзе. Тэмпература паветра ўначы будзе дасягаць мінус 8—14 градусаў, а пры праясненнях — 15—18 марозу. Удзень — мінус 5—11 градусаў, і толькі па паўднёвым захадзе ўначы 1—7 марозу, а ўдзень — ад 0 да мінус 4 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЛАТВІЙСКІХ ШПРОТАХ ВЫЯВІЛІ ШКОДНЫЯ РЭЧЫВЫ?

Рассельгаснагляд выявіў канцэраген бензапірэн у шпротах некаторых латвійскіх вытворцаў. Як паведамляе служба, пры правядзенні пагранічнага ветэрынарнага кантролю рыбных кансерваў у шпротах было выяўлена перавышэнне гранічна дапушчальнага ўзроўню канцэрагену бензапірэну. Гэта з'яўляецца парушэннем патрабаванняў заканадаўстваў Мытнага саюза і Расіі. Рассельгаснагляд растлумачыў, што бензапірэн небяспечны для чалавека нават у малой канцэнтрацыі, паколькі валодае ўласцівасцю назапашвацца ў арганізме. Аб тым, што здарылася, Рассельгаснагляд праінфармаваў тэрытарыяльныя ўпраўленні Расспажыўнагляду па Маскве і Маскоўскай вобласці з тым, каб небяспечная прадукцыя не была дапушчана да рэалізацыі. У рамках сваёй кампетэнцыі Рассельгаснагляд увёў рэжым узмоцненага лабараторнага кантролю за пастаўкамі гэтай прадукцыі. Лабараторным даследаванням падвергнулася прадукцыя прадпрыемстваў NA 007308, SIA Randa Klavas, Rojas pagasts, Rojas novads.

ВЫНОСЛІВАСЦЬ НЕ ГАРАНТУЕ АБАРОНУ АД ПРАБЛЕМ З СЭРЦАМ

Добрая фізічная форма ў падлеткавым узросце здольная знізіць рызыку сардэчных прыступаў у дарослым жыцці. Але не ўсё так проста. Паводле слоў навукоўцаў, неспартыўныя, худыя маладыя людзі больш абаронены ад праблем у параўнанні з поўнымі людзьмі, якія знаходзяцца ў добрай спартыўнай форме, піша Health India. Гэта паказаў аналіз 743 498 шведаў, якія праходзілі абследаванне ва ўзросце 18 гадоў. Пасля за ўдзельнікамі назіралі на працягу 34 гадоў, пакуль у тых не здараўся прыступ або яны паміралі. Такім чынам, добрая фізічная форма ў маладосці сапраўды зніжала рызыку сардэчнага прыступу. Але людзі з лішняй вагой, якія добра справіліся з тэстам на выносліваасць, усё ж мелі значна павышаную рызыку ў параўнанні з худымі, фізічна невынослівымі людзьмі. Значыць, сама па сабе фізічная форма ні пра што не гаворыць.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АРЫЭЛЯ ШАРОНА ПАХАВАЛІ НА СЯМЕЙНАЙ ФЕРМЕ

Былы прэм'ер-міністр Ізраіля Арыэль Шарон быў пахаваны 13 студзеня на сямейнай ферме, размешчанай у пустыні Негеў на поўдні гэтай краіны, побач з магілай сваёй жонкі Лілі Шарон. На цырымонію былі дапушчаны толькі спецыяльна запрошаныя госці, паведамляе BBC News. Па дарозе з Ерусаліма на сямейную ферму картэж з целам нябожчыка спыніўся каля ўзгоркаў Латрун, дзе Шарон быў паранены ў 1948 годзе падчас вайны за незалежнасць Ізраіля. Там яму былі аддадзены апошнія воінскія ўшанаванні. Раней каля будынка Кнесета прайшло публічнае развітанне з палітыкам, на якім прысутнічалі ў тым ліку прэзідэнт Ізраіля Шымон Перэс, віцэ-прэзідэнт ЗША Джон Байдэн і спецпрадстаўнік па Блізкім Усходзе Тоні Блэр. Расію на цырымоніі прадстаўляў спікер Дзярждумы Сяргей Нарышкін.

Паколькі Шарон быў не толькі палітыкам, але і вядомым ваенным дзеячам, яго пахаванне праходзіла па правілах ваеннай цырымоніі. Труну з целам неслі восем генерал-маёраў. Акрамя таго, «прыкрывала» пахаванне батарэя ПРА «Жалезны купал». Для гэтага камандаванне ізраільскай арміі змяніла месцазнаходжанне комплексу тактычнай сістэмы, разгарнуўшы яго побач з ранча Шарона, якое, у сваю чаргу, знаходзіцца ў небяспечнай блізкасці ад мяжы з сектарам Газа.

КОРАТКА

Шматдзетныя сем'і Мінска, якія выхоўваюць пяць і больш дзяцей школьнага ўзросту, атрымаюць па дзве базавыя велічыні на кожнае дзіця для змяншэння бацькоўскай даплаты за пуцёўку ў лагер.

Інфляцыя ў Беларусі за 2013 год склала 16,5 працэнта.

У Беларусі мінімальная заработная плата за снежань 2013 года індэксуецца на 13,1 працэнта і складае Br1 млн 532 тыс. 230, пагадзінная мінімальная заработная плата — Br9 тыс. 160.

Не менш як 9 млн т збожжа плануецца сабраць у Беларусі ў 2014 годзе.

Легендарны збройны канструктар Міхаіл Калашнікаў за паўгода да смерці напісаў пакаянны ліст Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу, у якім раскайваўся за створаны ім аўтамат, які забраў жыцці мноства людзей ва ўсім свеце.

«Еўрабачанне-2014»: СКАЖЫЦЕ «СЫ-ЫР»!

Дэлегата ад Беларусі на міжнародны песенны конкурс зноў абралі са скандалам

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У ноч з пятніцы на суботу ў сценах Белтэлерадыёкампаніі адбыўся канцэрт фіналістаў нацыянальнага адборачнага тура конкурсу «Еўрабачанне-2014». Пераможцу тэлегледачы і журы выбіралі ў прамым эфіры. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на генеральнай рэпетыцыі і ўласна на шоу, каб параўнаць уражанні.

БЯСКОНЦЫ МЮЗІКЛ «ЛЮДЗІ Ў ЧОРНЫМ»

Першае, што ўразіла на папярэднім прагоне: практычна ўсе фіналісты выйшлі на сцэну ў чорных уборах! Хіба толькі Тэа радаваў вока тэракотавым пінжаком, ды гурт «Switter boys» і блізняты сёстры Кароль фарсілі ў бялютких касцюмах ды блакітных сукенках. Няўжо гала-канцэрт нацыянальнага адбору — настолькі сумная падзея? «Гэта ж толькі рэпетыцыя, можа, пераапранецца», — выказала здагадку калега. Але і на шоу карцінка мала змянілася: 8 з 14 удзельнікаў дэманстравалі ўсе адценні чорнага...

На агульным фоне прыемна ўразіла Жанет. Пышная чорная сукенка падчас нумара «сцякала» са спявачкі, пакінуўшы тую ў белай туніцы, і ператварылася ў трох ці то ластавак, ці то кажаноў. «Мы прыдумалі гэты ўбор, на які пайшло амаль 30 метраў тканіны, і сам нумар літаральна за 5 дзён да новага года, — прызналася Жанет пасля выступлення. — Ідэя ў тым, што ўсе чорныя сілы саступаюць перад сілай кахання і дабрыні». І хоць сукенкі-трансформеры на «Еўрабачанні» дэманстраваліся неаднаразова, менш відовішчным нумар ад гэтага не стаў, а беларускі дызайнер Таццяна Давыдзенка спрацавала не горш за Юдашкіна.

СТАР.8